Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ЛІСТАПАДА 2015 г. ЧАЦВЕР № 219 (28077) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Пакаштуем кекс супермамы



Дачка Яна Скрыгана ўспамінае



Верны спосаб зняць стрэс

СТАР. 5

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$1 млрд 184,6 млн**

*склала дадатнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі краіны сёлета ў студзені—верасні. Гэта 192,5% да аналагічнага перыяду мінулага года. Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг у студзені–верасні склаўся на ўзроўні $49 млрд 75,6 млн, што на 25,7% менш, чым за студзень–верасень 2014-га. У тым ліку экспарт склаў $25 млрд 130,1 млн (знізіўся на 24,6%), імпарт — $23 млрд 945,5 млн (знізіўся на 26,8%). Сальда знешняга гандлю таварамі склалася адмоўным на ўзроўні $509,9 млн. У студзені—верасні 2014-га гэты паказчык таксама быў адмоўным і складаў $867,8 млн. Сальда знешняга гандлю паслугамі за дзевяць месяцаў склалася дадатным на ўзроўні $1 млрд 694,5 млн, што на 14,2% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17648,00 | ▲ |
| Еўра | 18958,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 273,28 | ▼ |
| Укр. грыўня | 774,88 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# АРТЭФАКТ З ВЯСКОВАГА ГАРЫШЧА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Падлеткі з вёскі Закальное Любанскага раёна прынеслі ў этнаграфічны пакой клубнага музея «новы» экспанат — самаробную дзіцячую каляску, зробленую адмысловымі майстрамі ў 30-х гадах мінулага стагоддзя. Дырэктар Закальнецкага Дома культуры Надзея МІРЭЙЧЫК радуецца незвычайнаму папаўненню музейнай калекцыі.**

■ Безнаяўны разлік

# БУДУЧАЯ ДЭНАМІНАЦЫЯ ВІРТУАЛЬНЫХ МАХЛЯРОЎ НЕ АКТЫВІЗУЕ

## Эксперты фінансавага рынку: налета ў ліпені не плануюць замены банкаматаў



**Начальнік галоўнага ўпраўлення развіцця лічбавых банкаўскіх тэхналогій Нацыянальнага банка Беларусі Аляксандр СОТНІКАЎ упэўнены, што ў сферы безнаяўных разлікаў запланаванае ўзбуйненне нацыянальнай грашовай адзінкі ніяк не паўплывае на бяспеку карыстальнікаў банкаўскімі карткамі. Тэхнічнае абслугоўванне банкаматаў ажыццяўляецца банкамі ў планавым рэжыме, і звычайныя карыстальнікі ўвогуле яго не заўважаюць.**

Спецыяліст упэўнены, што замяняць банкаматы ніхто не будзе. «Атрымаўшы інфармацыю ад Нацбанка аб правядзенні дэнамінацыі, безумоўна, усе беларускія банкі ўжо прыступілі да работы па пераналадцы праграмнага забеспячэння і набыцці для яго неабходных дапаўненняў, каб працаваць з новымі купюрамі», — сказаў прадстаўнік Нацбанка.

Аляксандр Сотнікаў выказаў здагадку, што з 1 ліпеня наступнага года адпаведныя прылады будуць выдаваць у першую чаргу дэнамінаваныя купюры. «З пункту гледжання банкаўскай логікі думаю, што ў кожным канкрэтным банкамаце будуць загружаны банкноты альбо новага, альбо старога ўзору. Наўрад ці будуць выкарыстоўвацца і тыя, і другія купюры адначасова», — выказаў сваю думку кіраўнік галоўнага ўпраўлення. У Нацбанку падлічылі, што выдаткі на падобнае пераабсталяванне будуць адэкватнымі падзеі і дакладна не вельмі вялікімі.

### Нулявая адказнасць працуе на 100%

Сёлета з 5 жніўня ў банкаўскай сферы пачала афіцыйна працаваць норма «нулявой адказнасці». Яна дзейнічае наступным чынам. Трымальнікі банкаўскіх картак павінны на працягу 30 дзён з даты сумнійнага спісання са свайго рахунку грошай іншымі асобамі звярнуцца з адпаведнай заявай у банк-эмітэнт. А апошні на працягу 45 дзён (плацеж быў на тэрыторыі Беларусі) і 90 дзён (спісанне грошай адбылося за межамі) павінен вярнуць незаконна знятыя грошы кліенту. Гэтае рашэнне рэгулятара зняло практычна ўсе праблемныя пытанні ўладальнікаў картак, што ўзнікалі з падобным махлярствам.

Аляксандр Сотнікаў адзначыў, што пасля 5 жніўня Нацбанк увогуле не атрымаў ніводнай скаргі з боку кліентаў на гэты конт. Апошнія сведчыць аб тым, што цяпер айчынныя банкі або вяртаюць кліентам "згубленыя" грошы, ці неяк па-іншаму вырашаюць спрэчныя сітуацыі. Напрыклад, спецыялісты Беларусбанка паведамілі, што ў першы месяц дзеяння гэтай нормы сярод іх кліентаў сустракаліся выпадкі сямейнага (сяброўскага) махлярства, калі ўладальнік карткі сам перадаваў свой «пластык» і пін-код іншым людзям. Пасля высвятлення падобных абставін прэтэнзіі да банка з боку кліента адразу знікалі.

### Адмова ад SMS-апавяшчэння правоў кліента не звузіць

Нагадаю, што менавіта ў жніўні банкі пачалі больш настойліва прапаноўваць сваім кліентам любым руху грашовых сродкаў на рахунку уладальніка карткі. Сёння такая паслуга ў большасці банкаў не бясплатная, а для асобных людзей даволі дарагая. Ці можна ад яе адмовіцца, і чым гэта кліенту пагражае?

СТАР. 3